

# Імкнуцца да ісціны, але не ўпадаць у крайнасці

*Да 65-годдзя з дня нараджэння Мікалая Сцяфанавіча Сташкевіча*

Імя Мікалая Сцяфанавіча Сташкевіча, доктара гістарычных навук, прафесара, добра вядома гісторыкам і настаўнікам не толькі нашай рэспубліцы, але і навукоўцам Расійскай Федэрацыі, Украіны, Польшчы, Германіі і іншых краін. Па яго навуковых працах, падручніках і дапаможніках вучацца пакаленні беларускіх студэнтаў і школьнікаў.

Нарадзіўся Мікалай Сцяфанавіч 23 жніўня 1938 г. у в. Мокрае Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і сялян-калгаснікаў Сцяфана Іванавіча і Лізаветы Іванаўны Сташкевічаў. Яму яшчэ не было і трох гадоў, калі на беларускую зямлю прыйшла вайна. Бацька, удзельнік савецка-фінляндскай вайны, зноў быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Савецкія войскі з цяжкімі баямі адступалі да Масквы. Пад Вязьмай дзесяткі савецкіх дывізій трапілі ў акружэнне. Нямногім удалося ўцалець у гэтай мясарубцы. Лёс уратаваў чырвонаармейца Сцяфана Сташкевіча, яму пашанцавала выйсці ў магілёўскія лясы, дзе ён актыўна ўключыўся ў партызанскую барацьбу. Сцяфан Іванавіч быў у адным партызанскім злучэнні з будучым прэзідэнтам АН БССР, акадэмікам М.А.Барысевічам.

На жаль, у Беларусі былі не толькі мужныя змагары за свабоду сваёй Радзімы, але і тыя, хто імкнуўся выжыць за кошт бяды іншых. Хтосьці данёс на партызанскую сям'ю Сташкевічаў. У 1943 г. Лізавета Іванаўна была арыштавана і адпраўлена ў канцлагер у Германію, Колю выхоўвала бабуля Марыя Іванаўна.

Лёс, на шчасце, быў літасцівым да гэтай сям'і. Сцяфан Сташкевіч вярнуўся з вайны, актыўна ўдзельнічаў у аднаўленні народнай гаспадаркі, працаваў старшынёй калгаса, але ў 1951 г. памёр. Не пакладаючы рук працавала і маці, якая вярнулася дамоў у 1946 г.

Школьныя гады Мікалая Сцяфанавіча прайшлі ў роднай вёсцы. Тут у 1956 г. ён закончыў Макранскую сярэднюю школу. Добра бачыў, як цяжка маці, і таму накіраваўся вучыцца не ў інстытут, а ў Горлаўскі горны тэхнікум, што на Украіне, каб хутчэй пайсці на свой хлеб. У 1958—1959 гг. ён працуе ў Енакіеве на гідрашахце № 4 майстрам цэха вентыляцыі, на свае вочы бачыць цяжкую і небяспечную працу шахцёраў.

Мікалая цягне да родных мясцін, і ў канцы 1959 г. ён пераехаў у Магілёў, дзе ўладкаваўся слесарам на завод "Электрарухавік". Але дасціпнаму юнаку хочацца вучыцца, і, працуючы на заводзе, ён старанна рыхтуецца да ўступных экзаменаў у ВНУ. Летам 1962 г. мара здзейснілася, і Мікалай Сташкевіч становіцца студэнтам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З вялікай цеплынёй і павагай гаворыць ён пра грунтоўныя веды і паважлівыя, хоць і вельмі патрабавальныя адносіны да студэнтаў з боку прафесараў Л.С.Абэцэдарскага, І.М.Ігнаценкі, Э.М.Загарульскага, Г.М.Ліўшыца, І.М.Лушчыцкага, М.П.Палецкі, А.П.П'янкова, У.М.Сікорскага, Р.М.Трухнова, А.П.Ігнаценкі і многіх іншых. Сапраўдны бацькоўскі клопат адчувалі студэнты з боку дэкана факультэта П.З.Савачкіна. Удзельнік Вялікай Айчыннай

вайны, баявы афіцэр і мудры чалавек, ён добра разумеў душу юнакоў таго пакалення.

У 1967 г. Мікалай Сташкевіч па размеркаванні Дзяржаўнай камісіі быў накіраваны на работу ў Інстытут гісторыі пры ЦК КПБ. З самага пачатку сваёй навуковай дзейнасці ён прытрымліваецца галоўных правіл універсітэцкай і акадэмічнай гістарычнай навукі: імкненне да ісціны на аснове грунтоўнага вывучэння першакрыніц і ўсебаковага аналізу гістарыяграфіі па даследуемай праблеме. Ён працуе мэтанакіравана, энергічна, добра разумее, што на навуковую працу пэўны адбітак накладвае партыйная ідэалогія.

Сферай навуковых інтарэсаў М.Сташкевіча становіцца даследаванне гісторыі Беларусі перыядаў грамадзянскай вайны і аднаўлення народнай гаспадаркі. Яму пашанцавала і з навуковым кіраўніком. У верасні 1973 г. пад кіраўніцтвам акадэміка І.М.Ігнаценкі ён паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму “Ідэалагічная дзейнасць бальшавікоў Беларусі ў гады грамадзянскай вайны (1918—1920 гг.)”.

Волю, энергію, добрыя арганізатарскія здольнасці, добразычлівыя і ў той жа час патрабавальныя адносіны М.Сташкевіча да людзей заўважае кіраўніцтва Інстытута гісторыі партыі. З 1974 па 1990 г. ён займае пасады старшага навуковага супрацоўніка, загадчыка сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, затым сектара гісторыі партыі, працуе загадчыкам аддзела гісторыі палітычных партый сацыялістычнай арыентацыі. У гэты час ім асабіста і ў сааўтарстве быў падрыхтаваны шэраг манаграфічных работ і калектыўных зборнікаў. Сярод іх найбольш значнымі з’яўляюцца: “Прыгавор рэвалюцыі: крушэнне антысавецкага руху ў Беларусі” (1985), “Бальшавікі Беларусі ў барацьбе за перамогу Кастрычніка” і “Дары данайцаў” (1987), “К.Каліноўскі: з друкаванай і рукапіснай спадчыны” і “Па волі народа” (1988), “Перабудова і міжнацыянальныя адносіны” (1989), “Старонкі Кампартыі Беларусі: меркаванні, аргументы, факты” (1990) і іншыя.

У 1970—1980-я гг. у навуковай дзейнасці М.Сташкевіча можна выдзеліць некалькі важнейшых кірункаў: беларускі нацыянальны рух у XIX—XX стст.; станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў XX ст.; праблемы гісторыі грамадскіх рухаў і палітычных партый; сацыяльна-класавыя адносіны ў савецкі перыяд.

У 1990 г. М.Сташкевіч абараніў доктарскую дысертацыю па тэме “Грамадскі рух у Беларусі: асноўныя ідэйныя плыні і палітычныя партыі (1917—1925 гг.)”. У публікацыях М.Сташкевіча па гэтай праблематыцы ўсебакова паказана гісторыя агульнарасійскіх, беларускіх, яўрэйскіх і польскіх палітычных партый, якія дзейнічалі ў Беларусі ў адзначаны перыяд, прааналізавана іх роля ў станаўленні і развіцці беларускай дзяржаўнасці. Для прац М.Сташкевіча характэрны неардынарны падыход, глыбокі навуковы ўзровень, шырокае выкарыстанне новых архіўных крыніц, крытычны і аб’ектыўны аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

У сувязі з рэарганізацыяй партыйных устаноў М.Сташкевіч у студзені 1992 г. быў прызначаны вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела архіўнай эўрыстыкі Беларускага навукова-даследчага цэнтра дакументазнаўства і рэтраінфармацыі. У сакавіку 1992 г. ён быў залічаны на работу ў Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін пры Белдзяржуніверсітэце на пасаду прафесара кафедры сусветнай і айчыннай гісторыі, а з верасня 1992 г., пасля рэарганізацыі гэтага інстытута, становіцца загадчыкам кафедры гісторыі і беларусазнаўства Нацыянальнага інстытута гуманітарных навук, які ў сваю чаргу ў 1994 г. быў рэарганізаваны ў Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ. У лістападзе 1999 г. М.Сташкевіч прызначаецца выконваючым абавязкі дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

У 1990-я гг. адбываюцца радыкальныя змены ў беларускай гістарычнай навуцы. У гэты час М.Сташкевіч значна пашырае тэматыку даследаванняў. З 1992 па 1995 г. ён быў кіраўніком часовага творчага калектыву па даследаванні комплекснай тэмы “Грамадска-палітычны рух (канец XIX—90-я гады XX ст.): гісторыя і праблемы сучаснасці. На матэрыялах Беларусі”, якая распрацоўвалася ў Фондзе фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь. На матэрыялах гэтага даследавання падрыхтаваны некалькі калектыўных манаграфій, навучальных дапаможнікаў, навуковых і навукова-папулярных артыкулаў. Аўтарам, а таксама навуковым рэдактарам многіх з іх з’яўляўся М.Сташкевіч. Сярод манаграфічных работ варта адзначыць такія: “Кастрычнік 1917 і лёсы палітычнай апазіцыі” (1993), “Палітычныя партыі Беларусі. Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі” (1994), “Станаўленне і крушэнне аднапартыйнай сістэмы ў СССР (1917—1991)” (1995), “Палітычныя партыі і палітычная паліцыя” (1995). Ён таксама прымаў удзел у падрыхтоўцы і быў сааўтарам такіх калектыўных прац, як “Беларусь на мяжы тысячагоддзяў” (2000), “Да адзінай дзяржавы: аб стварэнні руска-беларускай Саюзнай дзяржавы” (2001), “Очерки истории белорусов в Сибири в XIX—XX вв.” (2001) і іншых.

Вялікую ўвагу надае М.Сташкевіч выкладчыцкай дзейнасці. Ён чытаў курсы лекцый і спецкурсы па айчыннай гісторыі, гісторыі грамадскіх рухаў і палітычных партый, па гісторыі

дзяржавы і права Беларусі ў БДУ, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова, Мінскім інстытуце кіравання. Неаднаразова ён быў старшынёй Дзяржаўных камісій на выпускных экзаменах на гістарычных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь. 24 мая 1994 г. М.Сташкевічу прысвоена вучонае званне прафесара.

Пад рэдакцыяй М.Сташкевіча падрыхтаваны падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па гісторыі Беларусі для 9-, 10- і 11-х класаў агульнаадукацыйных школ. Ён актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы стандартаў і навучальных праграм па айчыннай гісторыі для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, уваходзіць у склад Дзяржаўнай камісіі і яе бюро па падрыхтоўцы падручнікаў у сферы сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Усяго М.Сташкевіч падрыхтаваў больш за 200 навуковых і навукова-метадычных работ, у тым ліку 12 манаграфій (з іх 8 калектыўных). Ён прымаў удзел і выступаў з дакладамі больш чым на 20 міжнародных і рэгіянальных канферэнцыях і сімпозіумах.

Шмат увагі надае М.Сташкевіч падрыхтоўцы маладых кадраў. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 5 кандыдацкіх і 2 доктарскія дысертацыі. Да лютага 2003 г. М.Сташкевіч быў старшынёй экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па гістарычных навуках, а з сакавіка 2003 г. ён член Прэзідыума ВАК.

М.Сташкевіч з'яўляецца членам рэдакцыйных калегій і аўтарам многіх артыкулаў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (у 6-ці тамах) і "Беларускай энцыклапедыі" (у 18-ці тамах).

Мікалай Сцяфанавіч быў адным з тых навукоўцаў, хто стаяў каля вытокаў стварэння "Беларускага гістарычнага часопіса". Рэдакцыйны калектыў вельмі ўдзячны яму за падтрымку, а чытачы — за тыя грунтоўныя артыкулы, якія падрыхтаваны для нашага выдання.

М.С.Сташкевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага савета БССР і медалём "Ветэран працы".

Калі ж падсумоўваць зробленае Мікалаем Сцяфанавічам Сташкевічам на ніве беларускай гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі, то трэба адзначыць, што яму ўласцівы вельмі беражлівыя адносіны да гістарычных фактаў, глыбокая павага да таго, што было зроблена папярэднікамі. Даследаванні М.Сташкевіча вызначаюцца добрай тэарэтычнай асновай і абгрунтаванасцю абагульняючых высноў. Як і ўсе гісторыкі, ён вымушаны быў улічваць палітычную і ідэалагічную сітуацыю, якая існавала ў савецкай гістарычнай навуцы, што, безумоўна, наклала адбітак на яго навуковыя творы.

У 1990-я гг. М.Сташкевіч, як і большасць беларускіх гісторыкаў, супярэчліва і часта з павышанай эмацыянальнасцю пераасэнсоўваў тое, што было ім зроблена да гэтага часу. Такое пераасэнсаванне не заўсёды правільна ўспрымалася як старэйшым, так і маладым пакаленнем гісторыкаў. Некаторыя апаненты імкнуліся абвінавачваць яго ў канфармізме. Гэта, на наш погляд, не мела пад сабой падстаў. М.Сташкевіч імкнуўся разбурыць тое, на чым трымаўся таталітарызм у гістарычнай навуцы і перш за ўсё ўсеагульны страх, які мы атрымалі ў спадчыну ад мінулага. Многія навукоўцы і выкладчыкі не змаглі ўсвядоміць, што тыя цяжкасці, якія ёсць сёння, — гэта не толькі змрочны цень мінулага. М.Сташкевіч знаходзіцца сярод тых навукоўцаў і выкладчыкаў, якія імкнуцца да праўдзівага адлюстравання гісторыі, заклікаюць не ўпадаць у крайнасці.

Менавіта ў такім кірунку працуе Інстытут гісторыі НАН Беларусі. З 2001 г. калектыў інстытута пад кіраўніцтвам М.Сташкевіча пачаў рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі". Дзяржаўная праграма ўключае 22 буйныя тэмы, у рамках якіх вядзецца даследаванне актуальных і недастаткова вывучаных праблем і працэсаў развіцця беларускага грамадства. Непасрэдна Інстытут гісторыі НАН Беларусі выконвае 13 тэм, з іх 7 — сумесна з кафедрамі гісторыі ВНУ рэспублікі.

У Мікалая Сцяфанавіча ёсць нямала творчых планаў і новых задум. І мы жадаем яму добрага здароўя, шчасця, дабрабыту, новых творчых поспехаў на карысць нашай Бацькаўшчыны.

**Васіль Кушнер,**
*галоўны рэдактар "Беларускага гістарычнага часопіса";*
**Пётр Дзмітрачкоў,**
*дэкан гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі;*
**Георгій Штыхаў,**
*доктар гістарычных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.*